**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных тэхналогіях

________________ А.М.Здрок
«06» января 2022 г.

Рэгістрацыйны № УД-10622/вуч.

# ПРАГРАМА ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

**для спецыяльнасці:**
1-23 01 08 Журналістыка (па напрамках),
**напрамак спецыяльнасці:**
1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ)

Праграма дзяржаўнага экзамену складзена на аснове адукацыйнага стандарту АСВА 1-23 01 08-2013 ад 30.08.2013 і вучэбных планаў №Е 23-263/вуч. ад 29.05.2015, №Е 23з-203/вуч. ад 30.05.2013.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Харытонава С.В., кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі:*
*Саянава Н.В., старшы выкладчык кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі*

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**

Кафедрай перыядычнага друку і вэб-журналістыкі
(пратакол № 7 ад 21.12.2021)
Саветам факультэта журналістыкі БДУ
(пратакол № 4 ад 30.11.2021)

Старшыня Савета
факультэта журналістыкі БДУ Самусевіч В.М.

Навукова-метадычным саветам БДУ
(пратакол № 3 ад 06.01.2022)

# Тлумачальная запіска

Дзяржаўны экзамен з'яўляецца адным з абавязковых складнікаў выніковай атэстацыі студэнтаў. Праграма комплекснага дзяржаўнага іспыту па спецыяльнасці і спецыялізацыі распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзяржаўнага адукацыйнага стандарту І ступені вышэйшай адукацыі і Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Праграма комплекснага дзяржаўнага іспыту вызначае і рэгламентуе структуру і змест комплекснага дзяржаўнага іспыту па спецыяльнасці 1-23 01 08 Журналістыка(па напрамках), напрамак 1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ).

У праграму комплекснага дзяржаўнага іспыту ўключаюцца наступныя навучальныя дысцыпліны агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў: «Асновы журналістыкі», «Асновы творчага майстэрства», «Канвергентныя СМІ», «Дызайн газеты», «Праблематыка СМІ».

Комплексны дзяржаўны іспыт праводзіцца на пасяджэнні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

Мэта правядзення комплекснага дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці - выяўленне кампетэнцый спецыяліста, г.зн. тэарэтычных ведаў і практычных уменняў, неабходных для вырашэння тэарэтычных і практычных задач спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

Праграма комплекснага дзяржаўнага іспыту носіць сістэмны, міждысцыплінарны характар і арыентавана на выяўленне ў выпускніка агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў і ўменняў.

Выпускнік павінен:

**ведаць:**

– сутнасць масавай камунікацыйнай дзейнасці і яе функцыі;

– сутнасць журналістыкі як творчай і арганізацыйнай дзейнасці ў галіне СМІ;

– сістэму СМІ РБ;

– прававыя, маральныя і эстэтычныя асновы журналістыкі;

– сутнасць эфектыўнасці і дзейснасці СМІ;

– асаблівасці работы творчых, тэхнічных і камерцыйных падраздзяленняў розных рэдакцый;

– спецыфіку працы ў рэкламным аддзеле;

– асноўныя напрамкі планавання работы рэдакцыі;

– спецыфіку журналістыкі і публіцыстыкі як творчай прафесійнай дзейнасці;

– гісторыю ўзнікнення і функцыянавання, сучасную канцэпцыю жанраў перыядычнага друку;

– роля прадмета, метадаў і форм адлюстравання рэчаіснасці ў журналістыцы як яе галоўных жанраўтваральных фактараў;

– патрэбы аўдыторыі ў журналісцкай інфармацыі, прадстаўленай у пэўных жанрах;

**умець:**

– аналізаваць асноўныя формы камунікацыйнай дзейнасці;

– характарызаваць сродкі масавай камунікацыі па тыпалагічных прыкметах;

– характарызаваць дзейнасць СМІ з боку носьбітаў інфармацыі: сродкі-каналы, тыпы выданняў-сістэма і ўзаемасувязі-распаўсюджванне;

– раскрываць асаблівасці СМІ ў сувязі з характарам журналісцкай дзейнасці ў канкрэтных сацыяльных умовах;

– складаць індывідуальныя і калектыўныя творчыя планы;

– працаваць у розных падраздзяленнях сучаснай рэдакцыі;

– складаць прыкладны бізнес-план рэдакцыі;

– працаваць на прэс-канферэнцыях і брыфінгах;

– эфектыўна выкарыстоўваць інтэрнэт у прафесійнай дзейнасці;

– ажыццяўляць збор інфармацыі з дапамогай розных метадаў і крыніц;

– ствараць журналісцкія матэрыялы з выкарыстаннем розных кампазіцыйных прыёмаў;

– выкарыстоўваць камунікатыўныя, прагматычныя і выразныя магчымасці розных жанраў;

**валодаць:**

– асноўнымі метадамі збору і апрацоўкі інфармацыі;

– рознымі тэхналогіямі стварэння журналісцкага твора;

– навыкамі работы з дапаможнымі тэхнічнымі сродкамі, якія прымяняюцца ў журналістыцы;

– прынцыпамі складання рэдакцыйных планаў;

– прафесійнай тэрміналогіяй і паняційным апаратам;

– формамі працы з аўдыторыяй;

– навыкамі самастойнага пошуку і распрацоўкі тэмы, працы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

– прыёмамі лагічнага асэнсавання і вобразнага адлюстравання рэчаіснасці, публіцыстычным і мастацкім метадамі;

– камунікатыўнымі стратэгіямі;

– спосабамі выкарыстання камунікатыўных, прагматычных і выразных магчымасцей розных журналісцкіх жанраў;

– навыкамі пісьменнай арганізацыі, афармлення і рэдагавання тэксту.

Засваенне адукацыйнай праграмы «Журналістыка (друкаваныя СМІ)» павінна забяспечыць фармаванне наступных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый:

**акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і працай з кампутарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

**прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Пастаянна ўдасканальваць метады стварэння журналісцкага кантэнту, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

ПК-2. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці.

ПК-10. Узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў у рамках выканання агульных творчых задач.

ПК-11. Весці перамовы з іншымі зацікаўленымі ўдзельнікамі, у тым ліку партнёрамі і кліентамі арганізацыі, органамі дзяржаўнага кіравання.

ПК-13. Ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывах развіцця галіны, інавацыйным тэхналогіям, праектам і рашэнням.

ПК-15. Працаваць з навуковай, тэхнічнай і патэнтнай літаратурай.

ПК-20. Праводзіць збор, апрацоўку, сістэматызацыю, актуалізацыю, прадстаўленне, распаўсюджванне, аналіз і інтэрпрэтацыю інфармацыі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій.

ПК-21. Ажыццяўляць распрацоўку, рэалізацыю і аптымізацыю інфармацыйных рэсурсаў і патокаў у арганізацыях.

ПК-26. Прадстаўляць вынікі праведзенай працы ў выглядзе справаздач, рэфератаў, артыкулаў, аформленых у адпаведнасці з наяўнымі патрабаваннямі з прыцягненнем сучасных сродкаў рэдагавання і друку.

ПК-27. Умець аналізаваць сацыяльна-значныя праблемы і працэсы ў кантэксце ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці і інфармацыйнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

ПК-28. Валодаць метадалогіяй дзейнасці па зборы, апрацоўцы і распаўсюджванні інфармацыі з дапамогай СМІ.

ПК-29. Умець прымяняць сістэму метадаў журналісцкай творчасці;

жанравыя разнавіднасці журналісцкага тэксту і асаблівасці працы над матэрыяламі розных жанраў.

ПК-29. Умець прымяняць сістэму метадаў журналісцкай творчасці;

жанравыя разнавіднасці журналісцкага тэксту і асаблівасці працы над матэрыяламі розных жанраў.

ПК-30. Ажыццяўляць збор і сістэматызацыю навукова-практычнай інфармацыі па тэме даследавання ў галіне інфармацыі і камунікацыі.

## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

Экзамен (адказы студэнтаў і гутарка з асобамі, якія экзаменуюцца) праводзіцца на рускай або беларускай мове.

У ходзе падрыхтоўкі студэнты маюць права выкарыстоўваць навучальныя праграмы адпаведных дысцыплін, а таксама павінны выкарыстоўваць творчае партфоліа, падрыхтоўка якога з’яляецца абавязковым патрабаваннем для допуска да дзяржаўнага экзамену.

На падрыхтоўку да адказу навучэнцу адводзіцца не менш за 30 хвілін (але не больш за 1 астранамічнай гадзіны). Час, які адводзіцца на адказ аднаго экзаменацыйнага, – да 30 хвілін.

Структура экзаменацыйнага білета

Экзаменацыйны білет складаецца з двух частак: тэарэтычнай (40 пытанняў) і практычнай (творчыя заданні па стылістычным і рэдактарскім аналізе медыятэксту, прэзентацыя партфоліа), якія дазваляюць ацаніць атрыманыя ў працэсе навучання веды і практычныя навыкі.

Для ўдакладнення экзаменацыйнай адзнакі навучэнцу могуць быць зададзены дадатковыя пытанні ў адпаведнасці з праграмай дзяржаўнага экзамена. Колькасць дадатковых пытанняў не павінна перавышаць тры.

Характарыстыка тэарэтычнай часткі:

Першае пытанне білета выўляе тэарэтычныя веды студэнта па профільных вучэбных дысцыплінах напрамку спецыяльнасці 1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ): «Асновы журналістыкі», «Асновы творчага майстэрства», «Канвергентныя СМІ», «Дызайн газеты», «Праблематыка СМІ».

Змест практычнай часткі экзаменацыйнага білета:

Першы блок арыентаваны на выяўленне творчых здольнасцей падчас навучання і праходжання практыкі. Навучэнцы дапускаюцца да дзяржаўнага экзамена пры наяўнасці творчай справаздачы (партфоліа). Справаздача складаецца з матэрыялаў, падрыхтаваных студэнтамі падчас вучэбнай, вытворчай, пераддыпломнай практыкі і пры самастойным супрацоўніцтве са СМІ за перыяд навучання. Студэнты абавязаны карыстацца партфоліа пры падрыхтоўцы адказу на пытанні першага блока. Выпускнікі павінны прадэманстраваць здольнасць рэалізацыі канкрэтных прафесійных заданняў, якія абавязаны ўмець выконваць супрацоўнікі рэдакцый СМІ.

Другі блок закліка  ны выявіць ўменні студэнта па стылістычным і рэдактарскім аналізе медыятэксту. Студэнты абавязаны паказаць валоданне

дзвюма дзяржаўнымі мовамі, прадэманстраваць веданне норм літаратурнага маўлення і ўменне ствараць рознастылёвыя тэксты.

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНА
# ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЗМЕСТ МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел 1. Вучэбная дысцыпліна “Асновы журналістыкі”

**Тэма 1. Сучасная журналістыка: стан, прызначэнне, сацыяльныя ролі.**

Змест паняццяў «журналістыка», «сродкі масавай інфармацыі», «сродкі масавай камунікацыі». Журналістыка ў сістэме сацыяльных інстытутаў Інфармацыйнае забеспячэнне рашэння палітычных, эканамічных, сацыяльных і іншых задач. Журналістыка як масава-інфармацыйная дзейнасць. Паняцце «масавай інфармацыі». Уласцівасці і прызначэнне масавай інфармацыі. Статыстычная, сэнсавая, сацыяльная інфармацыя. Удзел журналістыкі ў кіраванні і сацыяльным кантролі. Пытанне аб журналістыцы як «чацвёртай уладзе». Віды праявы ўлады. Мера «ўладных паўнамоцтваў» журналістыкі. Адносіны з «першай», «другой» і «трэцяй» уладамі. СМІ і інфармацыйны парадак у грамадстве.

**Тэма 2. Свабода друку і сацыяльная адказнасць журналіста.**

Паняцце «свабоды друку». Сацыяльна-творчы і юрыдычны аспект свабоды журналісцкай дзейнасці. Эканамічныя ўмовы і магчымасці рэалізацыі права на свабоду журналісцкай дзейнасці. «Залежнасці» ў журналістыцы. Праблема сацыяльнай адказнасці ў журналістыцы. Сацыяльная пазіцыя журналіста як культурна-ідэалагічная катэгорыя. Выбар пазіцыі і праблема незалежнасці журналіста.

**Тэма 3. Функцыі і прынцыпы журналістыкі.**

Функцыянальная роля СМІ ў грамадстве. Структура функцый журналістыкі. Камунікатыўная функцыя журналістыкі. Непасрэдна-арганізатарскія функцыі СМІ. Ідэалагічныя і культурафарміруючыя функцыі. СМІ і «масавая культура». Журналістыка і забаўленне. Рэкрэатыўныя функцыі СМІ. Функцыі журналістыкі як сістэма. Прынцыпы журналістыкі і сацыяльная пазіцыя журналіста. Сутнасць і механізм фарміравання прынцыпаў. Прычыны адрозненняў у інтэрпрэтацыі прынцыпаў (праўдзівасці, аб'ектыўнасці, народнасці, патрыятызму і інш.). Праблема адпаведнасці прынцыпам.

**Тэма 4. Паняцце «журналіст». Правы і абавязкі журналіста.**

Прававы статус журналіста. Прававая культура журналіста як элемент прафесійнай дзейнасці. Правы і абавязкі журналіста. Гарантыі абароны правоў журналіста. Адказнасць за перашкоду дзейнасці. Асаблівасці прававога рэгулявання сродкаў масавай інфармацыі.

**Тэма 5. Сістэма СМІ Рэспублікі Беларусь. Тыпалагічная характарыстыка.**

Кампаненты сістэмы СМІ Рэспублікі Беларусь. Газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт-выданні ў сістэме СМІ. Інфармацыйныя агенцтвы. Прэс-цэнтры, прэс-службы, службы па сувязях з грамадскасцю. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Тыпалогія як метад параўнальнага вывучэння істотных прыкмет СМІ. Тыпафарміруючыя прыкметы: характар аўдыторыі, прадметна-тэматычная скіраванасць, мэтавае прызначэнне выдання і іншыя фактары. Класіфікацыя СМІ Рэспублікі Беларусь. Эвалюцыя тыпалагічнай мадэлі СМІ ў працэсе рэфармавання грамадства.

**Тэма 6. Інфармацыйныя агенцтвы ў сістэме СМІ.** Інфармацыйныя агенцтвы ў сучаснай медыясферы: трансфармацыя пад уздзеяннем канвергенцыі. Асаблівасці арганізацыі работы рэдакцыі, падрыхтоўка аператыўнай інфармацыі. Сайт belta.by у нацыянальнай медыяпрасторы.

**Тэма 7. Паняцце і прававы статус рэдакцыі СМІ.**

Паняцце рэдакцыі СМІ ў прафесійным і юрыдычным вызначэнні. Заканадаўчае забеспячэнне дзейнасці СМІ. Парадак заснавання і рэгістрацыі СМІ. Заснавальнік сродкаў масавай інфармацыі. Статут рэдакцыі. Мэты, задачы і прынцыпы дзейнасці рэдакцыі. Органы кіравання рэдакцыі.

**Тэма 8. Кіраванне рэдакцыйным калектывам.**

Суб'екты кіравання прэсай. Узроўні менеджменту ў рэдакцыі. Функцыі супрацоўнікаў звяна кіравання: галоўны рэдактар, адказны сакратар, рэдакцыйны менеджэр, рэдкалегія, рэдакцыйны савет. Функцыі супрацоўнікаў звяна выканання: кіраўнікі творчых, тэхнічных і камерцыйных падраздзяленняў, журналісты. Сістэма кіравання рэдакцыяй. Прававыя, эканамічныя, псіхалагічныя і арганізацыйныя метады кіравання калектывам.

**Тэма 9. Фінансава-эканамічная дзейнасць рэдакцыі.**

Рэдакцыя сродкаў масавай інфармацыі як прадпрыемства. Артыкулы даходаў і выдаткаў. Бюджэт. Баланс. Прыбытак. Асноўныя і абаротныя сродкі. Фонд заработнай платы. Падаткі і адлічэнні ў дзяржаўны бюджэт. Бізнес-планаванне. Канкурэнцыя і канкурэнтаздольнасць. Масавая інфармацыя як тавар. Паняцце рэдакцыйнага маркетынгу.

**Тэма 10. Традыцыі і інавацыі ў рабоце сучасных СМІ.**

Сучасныя рэсурсы і магчымасці журналістыкі. Тэхналагічны прагрэс і медыярынак. Уплыў сучасных тэхналогій на структуру рэдакцыйнага апарату і арганізацыю яго працы. Электронныя базы дадзеных, архівы і дасье. Канвергентная журналістыка. «Грамадзянская» журналістыка. Інтэрнэт у працы журналіста. Перыядычныя выданні, тэлеканалы і радыёстанцыі ў Інтэрнэце. Блогерства. Мабільная журналістыка.

**Тэма 11. Літаратурна-мастацкая крытыка. Арт-журналістыка.**

Літаратурна-мастацкая крытыка. Культурна-асветніцкая журналістыка. Артэфакты мастацтва, літаратуры, навукі як прадмет арт-журналістыкі. Асноўныя жанравыя мадэлі культурна-асветніцкіх тэкстаў: анонс, анатацыя, рэцэнзія, творчы партрэт. Рэцэнзія як жанр літаратурна-мастацкай крытыкі. Сістэма вобразных сродкаў. Літаратурна-мастацкая крытыка ў спецыялізаваных і папулярных выданнях

**Тэма 12. Друкаваныя СМІ Беларусі ў інтэрнэце.**

Тыпалогія друкаваных інтэрнэт-СМІ. Друкаваныя выданні ў інтэрнэце: «клоны» і «гібрыды». Рэгіянальная прэса ў інтэрнэце. Спецыфіка ўзаемадзеяння традыцыйнай і інтэрнэт-рэдакцый. Асноўныя характарыстыкі вэб-версіі друкаванага СМІ. Службовыя абавязкі рэдактара інтэрнэт-выдання. Асаблівасці журналісцкай творчасці ў інтэрнэце.

**Тэма 13. Спецыялізаваныя выданні ў сістэме СМІ Рэспублікі Беларусь.**

Функцыянальнае прызначэнне спецыялізаваных выданняў. Спецыялізаваныя выданні ў адлюстраванні дзейнасці сацыяльных інстытутаў. Дзяржаўныя і недзяржаўныя спецыялізаваныя выданні: мэтавае прызначэнне, тэматыка, прыярытэтная праблематыка. Аўдыторыя спецыялізаваных выданняў. Форма і змест спецыялізаваных выданняў. Айчынныя галіновыя, прафесійныя, навуковыя выданні і інш.

**Тэма 14. Рэгіянальная прэса Рэспублікі Беларусь.**

Паняцце «рэгіён» у агульным і прыватным разуменні. Рэгіянальнае падзяленне Рэспублікі Беларусь. Тыпалагічныя характарыстыкі рэгіянальных газет. Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай інфармацыйнай прасторы. Прыярытэтная праблематыка рэгіянальных выданняў. Аўдыторыя рэгіянальных СМІ. Рэгіянальная і міжрэгіянальная прэса. Стан, праблемы і перспектывы сучаснай «раёнкі». Праблема кадравага забеспячэння раённага друку.

**Тэма 15. Медыяхолдынг як вынік трансфармацыі медыясістэмы.**

Працэсы глабалізацыі ў нацыянальнай медыясістэме. Прычыны і вынікі ўзбуйнення СМІ. Найбуйнейшыя беларускія мэдыяхолдынгі: РУП «Выдавецкі дом «Звязда», Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия», УП «Агентство «Минск – Новости», УП «БелТа», Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь і іншыя.

**Тэма 16. Дзіцячыя і маладзёжныя СМІ Рэспублікі Беларусь.**

Узроставыя катэгорыі чытачоў. Спецыфіка тэкставай і візуальнай інфармацыі. Паняцце «дзіцячая журналістыка». Выданні для дзяцей: мэты, тэматыка, функцыі. Актуальныя праблемы падлеткавай аўдыторыі. Выданні

для падлеткаў і рубрыкі для бацькоў. Паняцце «моладзь». Маладзёжныя СМІ Беларусі. Газета «Знамя юности» – гісторыя і сучаснасць. Праблематыка маладзежных СМІ. Адукацыйная і выхаваўчая функцыі дзіцячых і маладзёжных СМІ.

**Тэма 17. Часопісная перыёдыка Рэспублікі Беларусь.**

Часопіс як від СМІ. Тыпалогія часопісаў. Віды часопісаў і іх функцыянальнае прызначэнне. Аўдыторыя часопісаў. Сучасны стан беларускай часопіснай перыёдыкі. Мадэль беларускага часопіса ў кантэксце сучаснасці. Перспектывы развіцця рынку беларускай часопіснай прадукцыі. Замежныя часопісныя брэнды. Вопыт работы найбуйнейшых часопісных выданняў Беларусі і замежжа.

**Тэма 18. Спартыўная журналістыка. Жанры. СМІ.**

Спартыўныя СМІ Рэспублікі Беларусь. Спецыяфіка працы ў спартыўным выданні. Прафесійныя кампетэнцыі спартыўнага журналіста. Жанры спартыўнай журналістыкі. Спартыўны рэпартаж. Спартыўны каментарый. Спартыўны агляд. Асацыяцыя спартыўных журналістаў Беларусі.

**Тэма 19. Карпаратыўныя СМІ.**

Карпаратыўная прэса як індыкатар настрою прафесійнага грамадства. Шматтыражныя і карпаратыўныя выданні: традыцыі і перспектывы. Віды карпаратыўных выданняу: B2B, B2P, B2C.

**Тэма 20. Сувязі з грамадскасцю і журналістыка.**

Камунікацыя як працэс сацыяльнага ўзаемадзеяння. Мэты і ўмовы эфектыўнай камунікацыі. Асноўныя разнавіднасці камунікатыўных узаемадзеянняў. Структура камунікатыўнага працэсу. PR як форма камунікатыўнай дзейнасці. Агульныя правілы пабудовы гарманічнай камунікацыі са СМІ. Фарміраванне і ўмацаванне кантактаў з прадстаўнікамі масмедыя. Спецыфіка работы з прэсай. Прэс-цэнтры і прэс-службы Рэспублікі Беларусь. Прэс-рэліз: падрыхтоўка і рассылка.

## Прыкладны пералік пытанняў па раздзеле 1 для падрыхтоўкі да комплекснага дзяржаўнага экзамена

1. Сучасная журналістыка: стан, прызначэнне, сацыяльныя ролі.
2. Свабода друку і сацыяльная адказнасць журналіста.
3. Функцыі і прынцыпы журналістыкі.
4. Паняцце «журналіст». Правы і абавязкі журналіста.
5. Сістэма СМІ Рэспублікі Беларусь. Тыпалагічная характарыстыка.
6. Інфармацыйныя агенцтвы ў сістэме СМІ.
7. Паняцце і прававы статус рэдакцыі СМІ.

8. Кіраванне рэдакцыйным калектывам.
9. Фінансава-эканамічная дзейнасць рэдакцыі.
10. Традыцыі і інавацыі ў рабоце сучасных СМІ.
11. Літаратурна-мастацкая крытыка. Арт-журналістыка.
12. Друкаваныя СМІ Беларусі ў інтэрнэце.
13. Спецыялізаваныя выданні ў сістэме СМІ Рэспублікі Беларусь.
14. Рэгіянальная прэса Рэспублікі Беларусь.
15. Медыяхолдынг як вынік трансфармацыі медыясістэмы.
16. Дзіцячыя і маладзёжныя СМІ Рэспублікі Беларусь.
17. Часопісная перыёдыка Рэспублікі Беларусь.
18. Спартыўная журналістыка. Жанры. СМІ.
19. Карпаратыўныя СМІ.
20. Сувязі з грамадскасцю і журналістыка.

## Раздзел 2. Вучэбная дысцыпліна “Асновы творчага майстэрства”

### Тэма 1. Інфармацыйная журналістыка. Інфармацыйныя жанры.

Факт як аснова журналісцкага твора. Прырода і прызначэнне факта ў журналісцкім творы. Месца факта ў інфармацыйных жанрах. Навіна як аснова «журналістыкі факту». Асаблівасці групы інфармацыйных жанраў. Нататка і яе віды. Малыя жанравыя формы: анонс, анатацыя, бліц-апытанне, пытанне-адказ. Справаздача і яе разнавіднасці. Спецыфіка працы над рэпартажам. Сенсацыі і чуткі ў сучаснай журналістыцы.

### Тэма 2. Аналітычная журналістыка. Аналітычныя жанры.

Прадметна-функцыянальныя характарыстыкі аналітычнай журналістыкі. Прадмет аналізу ў журналісцкіх тэкстах: падзея, працэс, супярэчнасць, сітуацыя, ідэя, патрэба, асоба, рэч. Тэматыка і суб'екты аналітычнай журналістыкі. Асноўныя жанравыя мадэлі праблемна-аналітычнай журналістыкі. Каментар. Карэспандэнцыя. Агляд. Агляд СМІ і агляд прэсы. Артыкулі. Калумністыка. Блогерства. Праблема знікнення аўтарскіх матэрыялаў у прэсе.

### Тэма 3. Публіцыстыка і мастацка-публіцыстычныя жанры.

Публіцыстыка як сфера літаратурнай дзейнасці і яе асаблівасці. Сістэма мастацка-выяўленчых сродкаў публіцыстыкі. Сучасныя жанравыя мадэлі: нарыс, замалёўка, фельетон, эсэ. Разнавіднасці жанраў: прадмова, творчая біяграфія, партрэт-інтэрв'ю, партрэт-успамін. Тэндэнцыі сучасных мастацка-публіцыстычных жанраў. Публіцыстыка і публіцысты.

### Тэма 4. Канстатацыя і інтэрпрэтацыя ў журналісцкім творы.

Сутнасць метаду канстатацыі. Фіксацыя фактаў, падзей, сітуацый, найбольш значнага з убачанага і пачутага. Шматузроўневасць канстатацыі: хроніка, фіксацыя і падкрэсліванне логікі факта (стандартная нататка), дэталізацыя. Розніца ў фіксацыі жыццёвага факта (нататка, рэпартаж,

замалёўка) і фіксацыі слова (інтэрв’ю, справаздача). Актыўныя і пасіўныя інфармацыйныя формы. Фіксацыя ў спалучэнні з інтэрпрэтацыяй («факт з каментарыем» і іншыя камбінаваныя тэксты).

**Тэма 5. Публіцыстычны твор: факт, тэма, акцэнт, вобраз.**

Метад публіцыстыкі як спосаб адлюстравання сітуацыі. Тэма і акцэнт публіцыстычнага твора. Сістэма фактаў, сістэма аргументаў. Дэталізацыя. Аўтарскае самавыяўленне. Аўтарскі маналог у публіцыстычным творы. Візуальны вобраз сітуацыі. Гіпатэтычны вобраз сітуацыі. Комплексны вобраз публіцыстычнага твора. Імкненне да адназначных вывадаў. Эсэісцкі метад як форма вольнай размовы з чытачом.

**Тэма 6. Падрыхтоўка журналісцкага кантэнту. Крыніцы інфармацыі.**

Падрыхтоўка журналісцкага тэксту. Тэма, ідэя, факт. Крыніцы інфармацыі ў працы журналіста. Метады збору інфармацыі ў журналістыцы. Кампазіцыйная пабудова тэксту. Праверка фактаў. Верыфікацыя інфармацыі. Ацэнка і адбор навін. Журналістыка навін і яе асаблівасці. Формы падачы матэрыялу, інфатэйнмент як характарыстыка сучаснай медыясферы.

**Тэма 7. Вядомыя журналісты Беларусі: гісторыя і сучаснасць.**

Назапашванне і асэнсаванне прафесійнага вопыту. Вядомыя беларускія журналісты – арыенціры творчага пошуку для маладых. Беларускі саюз журналістаў. Конкурсы прафесійнага прызнання ("Залатая літара" і "Тэлевяршыня").

**Прыкладны пералік пытанняў па раздзеле 2 для падрыхтоўкі да комплекснага дзяржаўнага экзамена**

1. Інфармацыйная журналістыка. Інфармацыйныя жанры.
2. Аналітычная журналістыка. Аналітычныя жанры.
3. Публіцыстыка і мастацка-публіцыстычныя жанры
4. Канстатацыя і інтэрпрэтацыя ў журналісцкім творы.
5. Публіцыстычны твор: факт, тэма, акцэнт, вобраз.
6. Падрыхтоўка журналісцкага кантэнту. Крыніцы інфармацыі.
7. Вядомыя журналісты Беларусі: гісторыя і сучаснасць.

## Раздзел 3. Вучэбная дысцыпліна “Канвергентныя СМІ”

**Тэма 1. Універсальны журналіст. Мадыфікацыя прафесійна-творчых якасцей.**

Універсальны журналіст: мадыфікацыя творчых якасцей, функцый і абавязкаў у сучаснай медыясферы. Канвергентная журналістыка. Традыцыйныя і «новыя» і медыя: асноўныя крытэрыі дзейнасці. Кантэнт

СМІ. Трэнды журналістыкі. Мультымедыйный прадукт: уласцівасці і класіфікацыя.

**Тэма 2. Сучасныя тэндэнцыі на інфармацыйным полі: канвергенцыя, дыгіталізацыя і інш.**

Прагрэс у галіне інфармацыйных тэхналогій і змены на рынку СМІ. Журналісцкі інструментарый XXI ст. Уплыў сучасных тэхналогій на структуру рэдакцыйнага апарату, арганізацыю яго работы. Пераход на лічбавую форму захавання інфармацыі. Уласцівасці канвергентнай журналістыкі. Канвергентная рэдакцыя: мадыфікацыя функцый. Мультымедыйная, інтэгрыраваная і кросмедыйная рэдакцыі. Структура канвергентнага Інтэрнэт-выдання. Жанравыя асаблівасці Інтэрнэт-журналістыкі. Мульцімедыятызацыя грамадства. Канвергентная рэдакцыя: мадыфікацыя функцый. Мультымедыйная, інтэгрыраваная і кросмедыйная рэдакцыі.

**Тэма 3. Стратэгіі і фарматы працы друкаваных СМІ з кантэнтам сацыяльных медыя.**

Сацыяльныя сеткі як новая пляцоўка для СМІ. Асаблівасці фарміравання масавых інфармацыйных патокаў у сацыяльных медыя. Прыёмы суправаджэння акаўнтаў СМІ ў сацыяльных сетках «ВКонтакте», «Одноклассники», Facebook, Twitter, Instagram. Прынцыпы распрацоўкі і адаптацыі кантэнту. Новыя прылады працы з кантэнтам і супольнасцямі. Аўдыторыя сацыяльных сетак, асаблівасці яе паводзін.

**Тэма 4. Формы ўзаемадзеяння рэдакцый СМІ з аўдыторыяй.**

Сучасныя метады і формы ўзаемадзеяння рэдакцый выданняў і аўдыторыі. Акцыі ў сацыяльных сетках, фестывалі, лісты ў рэдакцыю, форумы, камэнтары карыстальнікаў на сайце і інш.

**Прыкладны пералік пытанняў па раздзеле 3 для падрыхтоўкі да комплекснага дзяржаўнага экзамена**

1. Універсальны журналіст. Мадыфікацыя прафесійна-творчых якасцей.
2. Сучасныя тэндэнцыі на інфармацыйным полі: канвергенцыя, дыгіталізацыя і інш.
3. Стратэгіі і фарматы працы друкаваных СМІ з кантэнтам сацыяльных медыя.
4. Формы ўзаемадзеяння рэдакцый СМІ з аўдыторыяй.

## Раздзел 4. Вучэбная дысцыпліна “Дызайн газеты”

**Тэма 1. Канцэпцыя СМІ і змястоўна-графічная мадэль газеты.**

Канцэпцыя СМІ як аснова распрацоўкі змястоўна-графічнай мадэлі. Сістэма зместавых, кампазіцыйных і графічных сродкаў. Выяўленне тыпалагічных параметраў выдання, яго задумы, задач, агульных прынцыпаў арганізацыі матэрыялу. Змястоўна-графічная мадэль і стабільнасць структуры друкаванага выдання. Прынцыпы фарміравання кампазіцыйна-графічнай мадэлі газеты.

**Тэма 2. Дызайн-мадэль перыядычнага выдання: змена прыярытэтаў графічнага іміджу.**

Дызайн-мадэль газеты і часопіса. Лагатып. Рубрыкацыя. Кампазіцыя. Калонкі. Шрыфт. Колер. Ілюстрацыі. Візуальныя акцэнты. Віды візуальнага кантэнту. Выбар аптымальнага спосабу адлюстравання інфармацыі.

**Тэма 3. Тэндэнцыя візуалізацыі ў сучаснай інфармацыйнай прасторы.**

Метады і прыёмы размяшчэння маленькіх, сярэдніх і буйных матэрыялаў на паласе. Кампазіцыя паласы, развароту. Заверстка фотапублікацый (фотанарысаў, фотарэпартажаў, фотазамалевак і г. д.). Формы, віды і жанры ілюстрацый. Функцыі ілюстрацыі. Сэнсавае ўспрыманне выяўленчай інфармацыі. Тэкставае суправаджэнне графікі, інфаграфіка і фотаграфікі ў друкаваных СМІ.

**Тэма 4. Фотажурналістыка і яе жанры.**

Асаблівасці і заканамернасці візуальнага ўспрыняцця. Паняцці «фатаграфія» і «фотаілюстрацыя». Фатаграфічнае паведамленне і кантэкст. Прынцыпы яго фарміравання. Кампазіцыя фотаілюстрацыі. Асноўныя віды жанраў сучаснай фотажурналістыкі: фотанататка, фотазамалёўка, фотарэпартаж. Фотакарэспандэнцыя, фотанарыс і фотамантаж як інструменты дасягнення мэт публіцыстычнага ўздзеяння на аўдыторыю. Праблемы пастановачных, арганізаваных і рэпартажных здымкаў, стварэння псіхалагічнага партрэта ў аналітычных і мастацка-публіцыстычных жанрах фотажурналістыкі. Тэндэнцыі сучаснай фотажурналістыкі. Вядомыя айчынныя і замежныя фотажурналісты.

### Прыкладны пералік пытанняў па раздзеле 4 для падрыхтоўкі да комплекснага дзяржаўнага экзамена

1. Канцэпцыя СМІ і змястоўна-графічная мадэль газеты.
2. Дызайн-мадэль перыядычнага выдання: змена прыярытэтаў графічнага іміджу.
3. Тэндэнцыя візуалізацыі ў сучаснай інфармацыйнай прасторы.
4. Фотажурналістыка і яе жанры.

## Раздзел 5. Вучэбная дысцыпліна “Праблематыка СМІ”

**Тэма 1. Эканамічная праблематыка ў друкаваных СМІ.**
Эканамічная праблематыка. Асноўныя паняцці эканомікі. Эканоміка Рэспублікі Беларусь: мінулае і сучаснасць. Эканамічная інфармацыя ў структуры беларускай журналістыкі. Адлюстраванне эканамічных праблем у СМІ.

**Тэма 2. Сацыяльная праблематыка у адлюстраванні друкаваных СМІ.** Паняцце сацыяльнай журналістыкі. Мадэлі, функцыі і механізмы сацыяльнай палітыкі. Гістарычныя тыпы сацыяльнай палітыкі. Сацыяльная праблематыка ў СМІ: адлюстраванне сацыяльных праблем у розных тыпах СМІ.

**Тэма 3. Журналістыка як палітычны інстытут грамадства.**
Палітычная арганізацыя грамадства. Роля журналістыкі ў функцыянаванні грамадства. Тэрміналагічны апарат. Навуковае і будзённае разуменне палітыкі. Палітычная сістэма. Палітычныя інстытуты. Палітыка як сацыяльная дзейнасць і майстэрства. Даследаванні СМІ паліталагічнай навукай. Сродкі масавай інфармацыі ў палітычнай сістэме грамадства. Тэорыя «чацвёртай улады». Грамадская думка і палітыка. Журналістыка і грамадская думка.

**Тэма 4. Палітычны каментарый ў журналістыцы.**
Палітычная культура журналіста. Сучасная журналістыка і яе патрэбы ў сацыяльна-палітычным бачанні з’яў і працэсаў. Структура палітычнай культуры і яе тыпалогія. Асаблівасці фарміравання новай палітычнай культуры ў Беларусі. Праблемна-тэматычныя напрамкі паліталогіі журналістыкі. Палітычная свядомасць і палітычная дзейнасць журналіста. Палітычная сацыялізацыя журналіста. Палітычныя мадэлі функцыянавання журналістыкі. Уладныя, аўдыторныя і эканамічныя рэгулятары палітычных мадэляў функцыянавання журналістыкі.

**Тэма 5. Культурная праблематыка ў друкаваных СМІ.**
Культура ў эпоху глабалізацыі і яе месца ў сусветных СМІ. Сутнасць працэсаў глабалізацыі. Этапы культурнай глабалізацыі. СМІ ў кантэксце культуры.

### Прыкладны пералік пытанняў па раздзеле 5 для падрыхтоўкі да комплекснага дзяржаўнага экзамена

1. Эканамічная праблематыка ў друкаваных СМІ.
2. Сацыяльная праблематыка у адлюстраванні друкаваных СМІ.
3. Журналістыка як палітычны інстытут грамадства.

4. Палітычны каментарый ў журналістыцы.
5. Культурная праблематыка ў друкаваных СМІ.

## ПРАКТЫЧНАЯ ЧАСТКА

### I. Партфоліа

Творчае партфоліа ўключае агульную справаздачу студэнта па відах вучэбнай дзейнасці, у тым ліку праектнай, а таксама па выніках праходжання практыкі за час навучання. Да справаздачы дадаюцца матэрыялы выпускніка (апублікаваныя ў газетах і часопісах журналісцкія матэрыялы, электронныя накапляльнікі з запісам тэле- і радыёперадач, адрэдагаваныя аўтарскія арыгіналы), а таксама ўласныя распрацоўкі па выкананні заданняў эўрыстычнага тыпу (у выглядзе канечнага інтэлектуальнага прадукту).

Асноўныя аспекты творчай справаздачы: спецыялізацыя журналіста, тэматыка матэрыялаў, жанры.

Партфоліа падаецца студэнтам на кафедру не пазней чым за тыдзень да здачы дзяржаўнага экзамену.

Партфоліа афармляецца ў асобную папку. На тытульным лісце адлюстроўваецца наступная інфармацыя: назва ўстановы адукацыі, найменне дакумента, прозвішча і ініцыялы студэнта, кіраўнікоў практык, спецыяльнасць, спіс практык, адзнакі за практыкі (дадатак А).

Загадчык кафедры робіць адзнаку аб допуску справаздачы да прадстаўлення ў ДЭК, пасля чаго творчае парфоліа дапускаецца да абароны дэканам.

Ацэнка творчага партфоліо.

Уявіце сябе ў ролі працадаўцы. Ахарактарызуйце і ацаніце творчае партфоліо суіскальніка (ад 4 да 10 балаў) па наступных крытэрыях:

- разнастайнасць жанравай палітры (прадстаўленасць інфармацыйных, аналітычных і мастацка-публіцыстычных жанраў);
- вобраз аўтара ў журналісцкім творы (аўтарскае «я» ў журналісцкім тэксце, творчая індывідуальнасць аўтара);
- тэматычны дыяпазон (тэматыка журналісцкіх тэкстаў, мэтавая аўдыторыя);
- фактычная аснова матэрыялу (спасылкі на крыніцы, дастатковасць фактаў, глыбіня раскрыцця тэмы).

Якія з прадстаўленых публікацый атрымалі найменшую колькасць балаў? Чаму? Якія тры матэрыялы Вы лічыце лепшымі? Абгрунтуйце адказ.

### II. Стылістычны і рэдактарскі аналіз медыятэксту

Стылістычны і рэдактарскі аналіз медыятэксту

Выпускніку даецца медыятэкст (вызначаецца парадкавым нумарам білета) для стылістычнага і рэдактарскага аналізу па прапанаванай схеме.

1. Спалучэнне ў тэксце публіцыстычнага стылю стандарту і экспрэсіі (наяўнасць моўных клішэ і адметных аўтарскіх канструкцый). Аўтарскі стыль журналіста, яго праявы ў тэксце (выкарыстанне займеннікаў “я” і “мы”, дзеясловаў 1-й асобы, мадальных слоў, рытарычных фігур, трапеічныхсродкаў і інш.).

2. Цэласнасць тэксту дзякуючы наяўнасці сэнсавага стрыжня, які «цэментуе» ўсе складнікі.

3. Рамачныя элементы тэксту. Адпаведнасць загалоўка лагічнаму закону тоеснасці ў адносінах да тэксту. Граматычная структура загалоўка, наяўнасць інтэртэкстуальных элементаў, іх правамернае або неправамернае ўключэнне і магчымасць расшыфроўкі чытачом. Кампазіцыя тэксту. Наяўнасць рубрык і іх загалоўкаў. Падзел на абзацы. Сувязі (граматычныя, сінанімічныя, сэнсавыя) паміж рубрыкацыйнымі адзінкамі.

4. Лексічнае напаўненне тэксту. Асаблівасці лексікі ў залежнасці ад тэматыкі публікацыі.

5. Марфалагічная стратыфікацыя журналісцкага тэксту. Выкарыстанне часцін мовы і асаблівасці іх ужывання ў тэксце.

6. Сінтаксічная разнастайнасць тэксту: выкарыстанне простых і складаных сказаў розных тыпаў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў, даданых азначальных частак, аднародных членаў і інш.

У заключэнні студэнт падводзіць вынік аналізу, прапануе (калі трэба) карэкціроўку асобных тэкставых фрагментаў з пункту гледжання рэдактарскага аналізу.

## Літаратура

1. Амзин, А. А. Интернет-журналистика: Как писать хорошие тексты, привлекать аудиторию и зарабатывать на этом. – М. : Издательство АСТ, 2020. – 400 с.
2. Амзин, А. Новостная интернет-журналистика: Учебное пособие для студентов вузов. – М. : Издательство АСТ, 2020. – 400 с.
3. Баранова, Е. А. Конвергентная журналистика: Теория и практика : учеб. пособие для бакалавриата и магистратуры / Е. А. Баранова. – М. : Юрайт, 2019. – 269 с.
4. Баранова, Е. А. Конвергенция СМИ устами журналистов-практиков : монография / Е. А. Баранова. – М. : Прометей, 2017. – 104 с.
5. Вартанова, Е. Л. Теория медиа: отечественный дискурс / Е. Л. Вартанова. – М. : Фак. журн. МГУ; Изд-во Моск. ун-та, 2019. – 224 с.
6. Вырковский, А. В. Редакционный менеджмент в печатных и онлайновых массмедиа: процессный подход / А. В. Вырковский. – М.: МедиаМир, 2016. – 384 с.
7. Градюшко, А. А. Основы интернет-журналистики : учеб.-метод. комплекс для студ., обуч. по спец. 1-23 01 08-03 «Журналистика (веб-журналистика)» / А. А. Градюшко. – Минск : БГУ, 2012. – 152 с.
8. Градюшко, А. А. Основы творческой деятельности веб-журналиста : учеб.-метод. пособие / А. А. Градюшко. – Минск : БГУ, 2019. – 239 с.
9. Градюшко, А. А. Современная веб-журналистика Беларуси / А. А. Градюшко. – Минск : БГУ, 2013. – 179 с.
10. Градюшко, А. А. Цифровая журналистика : пособие / А. А. Градюшко. Минск : БГУ, 2021. – 171 с.
11. Градюшко, А. А. Цифровая журналистика : пособие. – Минск : БГУ, 2021. – 171 с.
12. Градюшко, А.А. Основы творческой деятельности веб-журналиста. – Мн.: БГУ, 2019. – 239 с.
13. Гуртовая, Е. А. Визуальная коммуникация : учеб.-метод. пособие / Е. А. Гуртовая. – Минск : БГУ, 2019. – 99 с.
14. Дзялошинский И. М., Пильгун М. А. Современный медиатекст. особенности создания и функционирования. 2-е изд., испр. и доп. Учебник для вузов – М.:Издательство Юрайт, 2020 – 345с.
15. Журналистика и конвергенция: почему и как традиционные СМИ превращаются в мультимедийные / [авт.: А. Г. Качкаева и др.] ; под ред. А. Г. Качкаевой. – Москва : [б. и.], 2010. – 200 с.

16.Журналісцкае майстэрства [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. Комплекс / Д. А. Нікановіч [і інш.] ; пад агул. рэд. В. М. Самусевіч, Д. А. Нікановіча. – Мінск : БДУ, 2020.

17.Зуева, Г. С. Интернет-журналистика и онлайн-медиа : учеб.-метод. пособие / Г. С. Зуева. – Пенза : Изд-во ПГУ, 2021. –92 с.

18.Иваницкий, В. Л. Основы бизнес-моделирования СМИ : учеб. пособие для академич. бакалавриата / В. Л. Иваницкий. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2019. – 239 с.

19.Ильяхов М., Сарычева Л. Пиши, сокращай. Как создавать сильный текст. – М.: Альпина Паблишер, 2017. – 440 с.

20.Ильяхов, М. Пиши, сокращай: Как создать сильный текст / Максим Ильяхов, Людмила Сарычева. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Альпина Паблишер, 2018. – 440 с.

21.Как новые медиа изменили журналистику, 2012–2016 : сб. статей / ред.-сост. С. Балмаева ; под науч. ред. С. Балмаевой и М. Лукиной. – Екатеринбург : Гуманитарный ун-т ; М. : Кабинетный ученый, 2016. – 304 с.

22.Калмыков А.А. Коханова Л.А. Интернет-журналистика. Москва: Юнити-Дана, 2018. – 383 с.

23.Касютин, В. Л. Живая газета / В. Л. Касютин. – М. : Изд. Союза журналистов России, 2013. – 336 с.

24.Кирия, И. В. История и теория медиа : учеб. для вузов / И. В. Кирия, А. А. Новикова ; Нац. исслед. ун-т «Высшая школа экономики». – 2-е изд., испр. – М. : Издательский дом Высшей школы экономики, 2020. – 570 с.

25.Колесниченко А.В. Практическая журналистика. – М.: Издательство МГУ, 2020. – 334 с.

26.Кононов Н. Автор, ножницы, бумага. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2017. – 272 с.

27.Кононов, Н. В. Автор, ножницы, бумага: Как быстро писать впечатляющие тексты : 14 уроков / Н. В. Кононов. – 4-е изд. – М. : Манн, Иванов и Фербер, 2020. – 266 с.

28.Кульчицкая Д.Ю., Галустян А.А. Лонгриды в онлайн-СМИ. – М.: Аспект Пресс, 2017. – 80 с.

29.Кульчицкая, Д. Ю. Лонгриды в онлайн-СМИ : особенности и технология создания : учеб. пособие / Д. Ю. Кульчицкая, А. А. Галустян. – М. : Аспект-Пресс, 2017. – 79 с.

30.Мирошниченко, А. А. Когда умрут газеты / А. А. Мирошниченко. – М. : Книжный мир, 2011. – 222 с.

31.Мультимедийная журналистика / [авт.: А. Г. Качкаева и др.] ; под общ. ред. А. Г. Качкаевой, С. А. Шомовой. – Москва : Высшая школа экономики, 2017. – 413 с.

32.Мультимедийная журналистика/ под общ. ред. Качкаевой. - М.: Изд. Дом ВЭШ, 2017. - 413 с.

33.Нигматуллина, К. Р. Профессиональная культура журналистов в России / К. Р. Нигматуллина. – СПб.: Алетейя, 2021. – 286 с.

34.Нікановіч, Д. А. Тэорыя і практыка менеджменту кантэнту беларускіх СМІ / Д. А. Нікановіч ; навук. рэд. В. М. Самусевіч. – Мінск : БДУ, 2018. – 187 с.

35.Нікановіч, Д. А. Тэорыя і практыка менеджменту кантэнту беларускіх СМІ / Д. А. Нікановіч ; навук. рэд. В. М. Самусевіч. – Мінск : БДУ, 2018. – 187 с.

36.Основы журналистской деятельности / под ред. С. Г. Корконосенко. – М.: Издательство Юрайт, 2015. – 332 с.

37.Посталовский, А. В. Национальное информационное поле в контексте вызовов и угроз современного мира: социологическое измерение : монография / А. В. Посталовский. – Минск : РИВШ, 2019. – 236 с.

38.Работа журналиста в цифровой периодике : учебное пособие для студентов вузов / отв. ред. О. В. Смирнова. – Москва : Аспект Пресс, 2021. – 248 с.

39.Работа журналиста в цифровой периодике : учебное пособие для студентов вузов / отв. ред. О. В. Смирнова. – Москва : Аспект Пресс, 2021. – 248 с.

40.Распопова С. С. Основы журналистской деятельности. – М.: Аспект Пресс, 2017. – 272 с.

41.Самарцев О.Р. Творческая деятельность журналиста (очерки теории и практики): Учебное пособие для вузов. – М.: Академический проект, 2017. – 528 с.

42. Самусевіч, В. М. Жанры сучаснай журналістыкі: фармальна-структурны аспект / В. М. Самусевіч // Журналістыка ў суладдзі з жыццём: да 90-годдзя заслужанга дзеяча культуры Рэспублікі беларусь, доктара філалагічных навук, прафесара Барыса Васільевіча Стральцова: зб.навук.прац. – Мінск : БДУ, 2016. – 312 с. – С. 88–94 (0,4 п. л.).

43.Самусевіч, В.М. Інтэрпрэтацыя ў працэсе фарміравання грамадскай думкі / В. Самусевіч // Журналістыка-2016: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 18-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай 95-годдзю БДУ, 10-11 ліст. 2016 г., Мінск / рэдкал.: С.В.

Дубовік. – Вып.17. – Мінск: ААТ "Паліграфкамбінат імя Я.Коласа", 2016. – 552 с. – С.96-102.

44. Свороб, А. К., Дизайн газеты : учеб.-метод. комплекс / А.К. Свороб, С.В. Харитонова. – Минск : БГУ, 2015. – С. 118 с.

45. Силантьева, О. 92 мультимедийных формата / О. Силантьева. – [б. м.], 2018. – 60 с.

46. Силантьева, О. 92 мультимедийных формата. – [б. м.], 2018. – 60 с.

47. Силина-Ясинская, Т. В. Основы журналистики : учеб.-метод. комплекс / Т. В. Силина-Ясинская. – Минск : БГУ, 2015. – 99 с.

48. Соловьев, А. И. Современные технологии массмедиа : пособие / А. И. Соловьев ; БГУ. – Минск : БГУ, 2018. – 279 с.

49. Сотникова, О. П. Интернет-издание от А до Я: руководство для веб-редактора : учеб. пособие для студ. вузов / О. П. Сотникова. – М. : Аспект Пресс, 2014. – 157 с.

50. Степанов, В. А. Социальные медиа : учеб.-метод. пособие / В. А. Степанов. – Минск : БГУ, 2020. – 115 с.

51. Тертычный А. А. Жанры периодической печати. – М.: Аспект Пресс, 2017. – 320 с.

52. Тумилович, Н. В. Основы творческого мастерства : учеб.-метод. комплекс / Н. В. Тумилович. – Минск : БГУ, 2014. – 152 с.

53. Шимолин, В. И. Фотожурналистика в процессе трансформации медиапространства / В. И. Шимолин. – Минск : БГУ, 2017. – 247 с.

**ДАДАТАК**

**Беларускі дзяржаўны універсітэт**
**Інстытут журналістыкі**

**Кафедра перыядычнага друку**

**Творчая справаздача за перыяд навучання**

студэнта 4 курса
спецыяльнасці «Журналістыка
(друкаваныя СМІ)»

Іванова Мікалая Ігаравіча

Вучэбна-азнаямляльная практыка – І курс – адзнака (кіраўнік – )
Вытворчая практыка – ІІ курс – адзнака (кіраўнік – )
Вытворчая практыка – ІІІ курс – адзнака (кіраўнік – )
Вытворчая практыка – IV курс – адзнака (кіраўнік – )
Пераддыпломная практыка – IV курс – адзнака (кіраўнік – )

Мінск
2022